«Вясна» — «экстрэмісцкае фармаванне».
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Да 1,5 года калоніі: у Брэсце асудзілі дзявятую і дзясятую партыю па "справе карагодаў"

15.11.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, палітвязні, свабода мірных сходаў

У судзе Брэсцкага раёна 15 лістапада па "справе карагодаў" вынеслі прысуды адразу 15 берасцейцам. Іх усіх прызналі вінаватымі па ч. 1 арт. 342 Крымінальнага кодэкса (удзел у дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак). Нагадаем, 13 верасня мінулага года на Маршы герояў у Брэсце на скрыжаванні бульвара Касманаўтаў і праспекта Машэрава пратэстоўцы вадзілі карагод, спявалі песні «Муры» і «Тры чарапахі», танчылі. Пратэстоўцаў разагналі вадамётам, а потым узбудзілі крымінальную справу. Сёння 15 чалавек (дзявятую і дзясятую партыю) асудзілі на тэрміны ад года "хатняй хіміі" да 1,5 года калоніі. Палітзняволеных Ганну Баран і Уладзіміра Ганчарова, якія ўтрымліваюцца пад вартай, асуджаныя да паўтара года калоніі. Справу разглядала суддзя Кацярына Рамашка, дзяржаўнае абвінавачванне падтрымлівалі Аляксей Бараноўскі і Вадзім Багатка. Гэта адна з самых масавых «палітычных справаў» у гісторыі Беларусі — прысуды вынесеныя ўжо 102 чалавекам.



Брэст 13 верасня. Фота: МУС

Каму вынесены прысуды ў гэты раз?

15 лістапада былі асуджаныя па "справе карагодаў":

- **Палітзняволеная Ганна Баран — 1,5 года калоніі агульнага рэжыму (з 14 кастрычніка пад вартай);**
- **Аляксандр Вялічка, Вераніка Клімовіч, Вольга Гачынская, Святлана Якімовіч, Кацярына Ганчарова — 2 гады "хатняй хіміі",**
- **палітзняволены Уладзімір Ганчароў — 1,5 года калоніі агульнага рэжыму (з 24 ліпеня пад вартай);**
- **Сяргей Ярошкін, Павел Краўчук — 2,5 гады "хіміі";**
- **Валянціна Корсак — 2,5 гады "хатняй хіміі";**
- **Сяргей Лапко, Цімур Ломпік, Аляксей Якімовіч — 2 гады "хіміі";**
- **Аляксандр і Таццяна Паўлючыкі — 1 год "хатняй хіміі".**

Як піша брэсцкая "Вясна", гэтым разам судзілі адразу чатыры сямейныя пары: Паўлючыкаў, Якімавічаў, Гачынскіх і Ганчаровых. Аднак Руслана Гачынскага, якога пачалі судзіць у гэтай жа групе, працягнуць судзіць потым: яго справа вынесена ў асобную вытворчасць па прычыне хваробы Руслана.

Як абвінавачванне гучыць у матэрыялах справы?

Паводле версіі абвінавачвання, кожны з абвінавачаных у групе з іншымі асобамі наўмысна ўзяў актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак. Іх дзеянні былі спалучаныя з відавочным непадпарадкаваннем законным патрабаванням прадстаўнікоў улады, пацягнулі парушэнне працы транспарту, прадпрыемстваў і арганізацый. У прыватнасці, з-за прастою тралейбуснаму парку была нанесеная **шкода 619 рублёў 55 капеек, аўтобуснаму – 40 рублёў 37 капеек**, на некалькі гадзін зачыніліся гандлёвыя павільёны і рэстаран хуткага харчавання. Такая фармуліроўка гучыць ва ўсіх абвінавачваннях.

Як затрымалі палітвязняў па гэтай справе?

14 кастрычніка ў горадзе Пружаны Брэсцкай вобласці адбыўся шэраг вобшукаў ды затрыманняў. Большую частку людзей пасля выпусцілі з падпіскай аб неразгалошванні. Але не выйшла на волю 43-гадовая **Ганна Баран**. Ёй змянілі меру стрымання па "карагоднай" справе на ўтрыманне пад вартай і змясцілі ў СІЗА-7.

31-гадовы **Уладзімір Ганчароў** быў затрыманы 14 ліпеня трыма супрацоўнікамі ГУБАЗіК разам з сям'ёй (жонкай і дзецьмі 5 і 8 гадоў). Падчас допыту аператыўнікі з УУС Маскоўскага раёна Брэста чатыры гадзіны дзяцей трымалі ў калідоры. Пасля ўсіх перавезлі ў Следчы камітэт і там таксама дапытвалі чатыры гадзіны. Затым сям'ю адпусцілі, а Уладзіміра перавялі ў ІЧУ Кобрына, а адтуль — у брэсцкі СІЗА.



Ладзілі судовыя канвееры, у якіх судзілі непаўнагадовых, хворых і нават сем'і. Рэгіянальныя суддзі, якія больш за ўсё вынеслі “палітычных” прысудаў

"Вясна" склала спіс самых рэпрэсіўных суддзяў у рэгіёнах і распавядае, чым яны вызначыліся і хто пацярпеў ад іх "палітычных" прысудаў.



Вясна. Правы чалавека ў ...
10 244 подписчики

Подписаться на Страницу







Не менш за 15 чалавек выйшлі на волю па заканчэнні тэрмінаў у кастрычніку, адна з іх — жанчына

Палітвязня Аляксандра Арановіча будуць судзіць па новай крымінальнай справе. З ім няма сувязі амаль 5 месяцаў

Праваабарончая праграма "Вясна"

Дзмітрый Канеўскі: "Прэсінг у дачыненні да сябе ў калоніі я адчуваў штодня"







Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя перад выбарамі*2025. Першая справаздача кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары"

Асудзілі 14-ю групу берасцейцаў за ўдзел у пратэснай акцыі 10 жніўня 2020 года

Выбары*2025. Аналітычная справаздача аб утварэнні тэрытарыяльных выбарчых камісій

Масавы хапун у рэгіёнах і абнаўленне "экстрэмісцкіх" спісаў: хроніка пераследу 6-11 лістапада

Камітэт па замежных справах парламенту Чэхіі заклікаў вызваліць Алеся Бяляцкага і ўсіх палітвязняў ў Беларусі

Алег Арлоў пра задушэнне свобод у Расіі, сваё вызваленне і палітзняволенага сябра Алеся Бяляцкага

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Кастрычнік 2024

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2025







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская Группа

СЯБРОЎСТВА

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

european platform for democratic elections
epde













E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

